Assoziation
der WeissrussInnen
in der Schweiz

Huebwiesenstr. 31
CH-8954 Geroldswil
+41 78 666 70 90
info@belswiss.org
www.belswiss.org



# Асацыяцыя беларусаў у Швейцарыі

запрашае вас на

# КУПАЛЛЕ

Мы прапануем вам забыцца на жыццёвыя праблемы і аднастайную штодзённасць, апынуцца гэтым вечарам у месцы, дзе вас чакае таямнічае і чарадзейнае Купалле. Разам з Купалай і Купалкай мы пройдзем па сцяжынках векавой гісторыі, навучымся танчыць старадаўнія танцы і вадзіць карагоды, спяваць купальскія песні і плесці вянкі, пагуляем у гульні і пакаштуем беларускіх прысмакаў.

І — хто ведае? — магчыма, менавіта гэтым вечарам
знойдзем сапраўдную папараць-кветку…

На свята мы чакаем адмысловых гасцей з Беларусі:

**Арт-групу «ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА»**
з праграмай **«АЎТЭНТЫЧНАЕ КУПАЛЛЕ»**

## Дата і час

Субота, **25 чэрвеня** 2016.
Пачатак у **16:00**, канец афіцыйнай часткі ў 20:00.
(Не спазняйцеся, інакш прапусціце ўсё самае цікавае!)

## Месца правядзення

Бераг ракі Аарэ (*Aare*), у вёсцы Муры (*Muri bei Bern*), кантон Берн.
Мапа мясцовасці: http://map.search.ch/d/zq0mtiyzw

Адлегласць ад аўтамабільнай стаянкі *Unterer Wehrliweg* да месца правядзення: каля 500 м. Адлегласць ад прыпынку аўтобуса № 40 *Muri b. Bern, Bahnhof* і прыпынку трамвая № 6 *Muri bei Bern*: каля 1 км.

Па жаданню можа быць арганізаваны падвоз у межах Муры і бліжэйшага наваколля. Таксама дапаможам з арганізацыяй сумесных аўтамабільных паездак.

## Фармат мерапрыемства

Свята Івана Купалы пройдзе на беразе ракі Аарэ ў нефармальнай абстаноўцы: народныя і сярэднявечныя танцы, карагоды ля вогнішча, майстар-клас па пляценні вянкоў, гульні і забаўлянкі, вольныя камунікацыі, новыя знаёмствы, музыка і спевы.

Будзе арганізаваны агульны стол з алкагольнымі і безалкагольнымі напоямі, беларускімі нацыянальнымі закускамі, аднаразовым посудам і неабходнымі паходня-кухоннымі прыладамі. На працягу вечара будзе магчымасць набыць загадзя заказаны гатовы шашлык.

Працоўная мова — беларуская (з паслядоўным перакладам на рускую, нямецкую, ангельскую, імправізацыйна-пальцавую і, па жаданні, іншыя мовы).

## Кошты

Унёсак удзельніка — **35** шв. франкаў.
Для зарэгістраваных сяброў Асацыяцыі — **20** шв. франкаў.
Дзеці і падлеткі да 16 год, а таксама ганаровыя госці — **бясплатна**.

Порцыя шашлыку (200 г) — **10** шв. франкаў. (Калі ласка, замаўляйце загадзя!)

У кошт унёску ўваходзіць амаль* што усё **(!)** — інфраструктура, забаўляльная праграма, ежа*, напоі і іншыя арганізацыйныя выдаткі.

(* Шашлык аплачваецца асобна.)

Аплаціць унёсак можна альбо наяўнымі пад час мерапрыемства, альбо папярэднім пераводам на наш банкаўскі рахунак: *Assoziation der WeissrussInnen in der Schweiz*, **CH1009000000605505782** (PostFinance).

## Рэгістрацыя

Калі ласка, **абавязкова паведаміце нам** (гл. раздзел «Кантакты») аб сваім жаданні прыняць удзел у мерапрыемстве, вызначце колькасць і катэгорыю (гл. вышэй) ўдзельнікаў і, калі трэба, колькасць порцый шашлыку. Дзякуй загадзя!

## Дадатковая інфармацыя

Пры сабе пажадана мець:

- нацыянальныя строі сваёй краіны альбо вопратку, якая іх імітуе;
- купальныя прыналежнасці (плавальны касцюм, ручнік);
- купальскі вянок (яго можна таксама сплесці адразу на свяце);
- добры настрой.

## Кантакты

| | |
|---|---|
| Асацыяцыя беларусаў у Швейцарыі | **info@belswiss.org**<br>facebook.com/belswiss |
| Аляксандр Сапега | +41 78 666 70 90 |
| Сяргей Сіроткін | +41 79 582 25 81 |
| Вольга Крук | **+41 79 938 82 15** |

**Будзем радыя сустрэчы з вамі!**